Верш «Вільня» , які мы маем зараз, заканчваецца радкамі: «Ну дзе ж сягоння, родны горад, / Мяне прытуліш без начлегу?» [5, с. 98]. Эпітэт «родны» тут з'явіўся невыпадкова: Максім Танк зразумеў, што нават шэрае, бруднае на першы погляд месца можа стаць родным, блізкім, і менавіта пачуцці,перажытыя ў гэтым месцы робяць яго такім. У той жа час частка яго душы застаецца ў вёсцы:

Як быццам, адходзячы ў горад,
Забыўся асенняй парой
Сказаць, каб шчаслівыя зоры
Гарэлі над вёскай маёй [5, с. 367].

## Літаратура


1. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1996. – Т. 2. Вершы, пераклады. 1908–1910. – 342 с.
2. Купала, Я. Поўны збор твораў. У 9 т., Т. 5. Вершы, пераклады 1930 – 1942 / Я. Купала. – Мінск : Маст. літ., 1998. 156 с.
3. Лойка, А. Як агонь, як вада…: раман-эсэ пра Янку Купалу / А. Лойка. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 448 с.
4. Танк, М. Збор твораў у чатырох тамах. Т. 1. Вершы і паэмы / М. Танк. – Мінск: Беларусь, 1966. – 576 с.
5. Танк, М. На этапах. Вершы [факсімільнае выданне] / М. Танк. – Мінск: Маст. літ., 1983. – 128 с.


***В.Д. Старычонак, г. Мінск***

# «Я мушу пакінуць адбітак жыцця на камні, жалезе і золаце»: гіпербала і градацыя ў паэтычных творах Максіма Танка

Творчасць Максіма Танка лічыцца люстэркам жыцця беларускага народа другой паловы ХХ ст., дзе арганічна спалучыліся вечныя і агульначалавечыя тэмы. Творы народнага паэта Беларусі характарызуюцца «разважлівасцю філасофскага роздуму, натуральнасцю аўтарскага расповеду, нязмушанасцю інтанацыі, пластычнай выразнасцю рэчаў-дэталяў, лірычнай мяккасцю фарбаў і адценняў» [1, с. 232]. Адной з адметных рыс творчай манеры Максіма Танка з'яўляецца ўмелае выкарыстанне вобразна-выяўленчых сродкаў, сярод якіх значнае месца займаюць гіпербалы і градацыі. Гіпербала як моцнае перабольшванне якіх-небудзь уласцівасцей чалавека, прадмета або з'явы ўжываецца з мэтай завастрэння і канцэнтрацыі ўвагі на тых ці іншых прыметах дэнатата, актуалізацыі пэўных аспектаў сэнсавай структуры слова.

Даволі пашыранай лічыцца квантытатыўная разнавіднасць гіпербалы, якая будуецца на перабольшванні колькасных паказчыкаў, а таксама значным

павелічэнні меры і ступені праяўлення прыметы. Стварэнню квантытатыўных гіпербал спрыяе ўжыванне ў тэкстах лічэбнікаў і складаных слоў з першай лічэбнікавай часткай, велічыня і лік якіх характарызуць тую ці іншую ступень перабольшвання. У паэтычных радках Максіма Танка гіпербалічны малюнак часцей за ўсё ствараецца пры дапамозе слоў *тысяча* і *мільён*: *Ён [агонь]* ***тысячу*** *раз нараджаўся, Паміраў І зноў нараджаўся. Ён такі ж спрадвечны, Як зоры; І праз* ***тысячу*** *год, хлопцы, Не вазьмуся за пяро я!;* ***Мільёны*** *сонц-сланечнікаў Калышуцца над намі; Я сёння хацеў напісаць Верш пра цябе І прапусціць праз яго радкі* ***Мільёнавольтны*** *ток маёй любові.*

Многія гіпербалы-квантытатывы характарызуюцца суаднесенасцю з вялікай воднай прасторай, яе неабмежаванасцю, значнай колькасцю, мноствам чаго-небудзь. У якасці дамінанты ў гэтай групе выступае назоўнік *мора*, другасныя ЛСВ якога ўказваюць на вялікую колькасць раслін, збажыны, снегу, людзей, моцны гул галасоў і інш.: ***Мора*** *каласоў; Васіль успомніў* ***мора*** *каласоў, жніво; Вецер гладзіць хмараў цені,* ***мора*** *жыта;* ***Мора*** *чароту; Калышацца снежнае* ***мора*** *На крылах мяцеліцы; Хвалявалася* ***мора*** *сцягоў і людзей; І пахіснулася* ***мора*** *людское;* ***Мора*** *вогненных рэклам; Плешча* ***мора*** *людскіх галасоў.*

У полісеманта *акіян* другасны квантытатыўны ЛСВ развіваецца па прадуктыўнай мадэлі ‘воднае прастора паміж мацерыкамі’ → ‘што-небудзь неабсяжнае, неабдымнае’: *Акіян траў; І акіянамі ніў ураджайных ідуць камбайны.*

Гіпербалізацыя назоўнікаў *рака* і *рэчышча* ажыццяўляецца ў пантэістычным кірунку. У якасці крыніцы метафарычнай экспансіі выступаюць першасныя ЛСВ гэтых слоў, якія атаясамліваюцца са смуткам, цяжкасцямі жыцця чалавека, а таксама радасцямі чалавечага быцця: ***Рэкі*** *слёзаў няўцешных, гарачых;* ***Рэкі*** *смутку і радасці Я пераходзіў не раз; Толькі шмат вякоў быў у ярме народ. Шмат вякоў тады плыў* ***рэчышчамі*** *пот.*

Прыметы ‘вялікая колькасць, мноства чаго-небудзь’, ‘вялікая плошча чаго-небудзь’ акцэнтуюцца ў субстантывах з першаснымі ЛСВ ‘войска’, ‘масіў зямлі, зарослы дрэвамі’: *Цэлая* ***армія*** *Рэдактараў, стылістаў, Карэктараў Правярае кожнае слова; Калыша* ***лес*** *зялёнай асакі.*

У вершы «Вятрак» паэт у гіпербалічнай форме апавядае пра вялікую сілу і моц крылаў ветрака, што нястомна махаюць і абвяшчаюць на ўвесь свет пра няўрымслівыя аблокі, пра ластавак-шчабятух, вецер-гуляку, найпрыгажэйшую ў свеце дачку млынара.

Семантыка многіх гіпербал арыентавана на выражэнне вышыні пэўных прадметаў, своеасаблівам вымяральнікам якіх можа служыць вялікая і практычна недасягальная адлегласць да зорак і неба: *Бор вяршынамі сваімі дакранае* ***зор****; Вяршыняю* ***зоры*** *кранае яна [сасна]; З якіх бы ні прыйшоў шляхоў, З гарачай*

*ласкай прывітаюць Цябе ля гэтых рубяжоў Бары, узняўшыся* ***да зораў****; Дужэйце і расціце так, каб кроны падпіралі* ***неба*** */ хмары не змаглі ніяк Вас вырваць з гэтай роднай глебы.*

У вершы «На выгане» паэт стварае метафарычна-гіпербалічны і даволі дынамічны малюнак, які перадае празмерную моц і сілу рыку дамашняй жывёлы: пры фальшывым гуку берасцяной трубы пастуха важак статка крутарогіх кароў і бугаёў адзываецца такім гучным ровам, што сцішаецца бор, абуджаецца сонца, ападаюць росы і глухнуць пеўні:

Калі ж пачне пастух фальшывіць,
Ў ігру ўмяшаецца важак [бугай]
І, рогі ўскінуўшы на шыю,
Паправіць гулкім басам так,
Што сцішыцца бор стогалосы
І сонца збудзіцца ў імгле,
Паападаюць з дрэваў росы,
Паглухнуць пеўні на сяле.

З мэтай апісаць яркасць і агністасць колераў суквецця канюшыны паэт выкарыстоўвае гіпербала-метафарычны прыём: шматлікія фарбы і колеры кветак, іх іскрыстасць і зіхаценне нібыта ствараюць пажар: *Цэлы тыдзень Пчолы з чмялямі* ***Падпальвалі суквецце*** *канюшыны. І вось яно* ***ўспыхнула*** *І* ***разгарэлася*** *так, Што аж трэба было Бегчы з косамі, з граблямі, Каб* ***агонь*** *часам не перакінуўся На сялібы.*

Паэт захапляецца зарой над Нараччу, якая па колеравай гаме і прыгажосці пераўзыходзіць сплаў усіх зор у горане, а таксама сабраныя разам скарбы, серабро і золата: *Каб сабраць усе* ***скарбы*** */* ***срэбра*** *і* ***золата*** */ з усіх* ***зор*** *у горане* ***Жар*** *распаліць, Дык не выкулі б гэткай зары, Як над Нараччу.*

У шматлікіх касмічных медытацыях Максіма Танка ўвага засяроджваецца на падабенстве нябесных свяціл і зямлі. Далёкія планеты нагадваюць зямлю, а зорная ноч у час веснавога разводдзя параўноўваецца з Млечным Шляхам: *Мы ідзём асцярожна Млечным Шляхам адбітым Так, каб не наступіць нам На чыюсьці зорку.*

На часавай прымеце пабудаваны гіпербалічны выраз аб продажы старых рэчаў, якія быццам бы захаваліся з часоў патопу: *На вуліцах… прадаюць стар'ё з часоў патопу.* Аўтар пры гэтым не без ноткі гумару апісвае «вечны шум і гам» стамбульскай экзотыкі.

Часам гіпербалы выяўляюцца ў структуры тэксту, пабудаваным на параўнаннях, проціпастаўленнях: *Слёзы, быццам зоры ўсяго неба, сыплюцца на вочы дожджам залатым; Мандарыны, бы мільёны сонц; Не хлеб, а сапраўднае сонца.*

У некаторых творах Максіма Танка гіпербала арганічна спалучаецца з градацыяй – стылістычным прыёмам размяшчэння слоў і выразаў, якія прадугледжваюць узрастанне, узмацненне сілы і выразнасці слоў, павышэнне іх экспрэсіўнасці. Так, у вершы «Паэзія», які мае рытміка-градацыйную будову, паэзія параўноўваецца з бліскавіцай, вызваленнем з няволі, вясновай кветкай, следам разведчыка, з пацалункам, дружбай і радасцю, скарынкай хлеба і сокам вінаграду. Але ўсе гэтыя параўнанні і азначэнні не ахопліваюць сутнасці паэзіі, якая ў апошніх чатырохрадкоўях атаясамліваецца з крывёй чалавека, сонцам, з жыццём чалавека наогул:

А ты аказалася большым:
Ты – кроў, што пульсуе па жылах,
Ты – сонца, якое
Прасторы святлом азарыла,

І без чаго, як без маці
Або без радзімы,
Ні нараджацца, ні жыць
На зямлі немагчыма!

У філасофскім вершы «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека» выкарыстоўваюцца вялікія магчымасці градацыі ў спалучэнні з анафарай, што дазваляе аўтару выразна і пераканаўча акрэсліць тэму разважання, перадаць вопыт, мудрасць, скандэнсаванасць думак цэлых пакаленняў людзей. Словы і выразы *«намёк на чалавека», «чвэрць чалавека», «паўчалавека», «чалавек»* групуюцца ў парадку нарастання іх сэнсавай і эмацыянальнай выразнасці. І толькі тады чалавек «здзяйсняецца», калі ён патрэбен людзям, можа ім дапамагчы, калі ўсе могуць спадзявацца на яго.

Ты яшчэ толькі намёк на чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на маці;
Ты яшчэ – чвэрць чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на дружбу;
Ты толькі – паўчалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на любоў, –
І толькі тады становішся чалавекам,
Калі ўсе могуць спадзявацца
На цябе.

У структуры чатырохрадковага верша «Голас» узрастае сэнсавая значнасць, павышаецца экспрэсіўнасць кожнага наступнага радка, які пачынаецца адным і тым жа словам-анафарай. Другое і апошнія словы кожнага радка групуюцца па

нарастанні сэнсавай процiпастаўленасці і выразнасці: незнаёмы – друг – любая – маці; здзівіць – спыніць – сагрэць сонцам – вярнуць з таго свету.

Голас незнаёмага можа здзівіць,
Голас друга – на хвіліну спыніць,
Голас любай – сагрэць сонцам лета,
Голас маці – вярнуць з таго свету.

У гэтым афарыстычным вершы выражаецца бязмежная любоў маці да дзяцей, услаўленне маці, голас якой можа нават вярнуць з таго свету. Безумоўна, гэты верш пабудаваны на скразной метафары, заснаванай на жыццёвай ісціне: калі дзіця аказваецца ў небяспецы, маці можа зрабіць усё магчымае, каб яго выратаваць; яе голас прымушае жыць і змагацца, калі губляецца сэнс жыцця і душа пачынае стыць.

Прыём градацыі выкарыстаны ў назве кнігі і аднайменным вершы «На камні, жалезе і золаце»: камень сімвалізуе дні мінулай няволі, адзінокія курганы; жалеза – акопы вайны, разбітыя высокія сосны; золата – свята краіны з салютамі і незгасальнай зарой.

Такім чынам, гіпербала і градацыя ў творах Максіма Танка выкарыстоўваюцца як дзейсныя мастацкія сродкі, дзякуючы якім дасягаецца ўзмацненне пэўных якасцей і ўласцівасцей прадметаў і з’яў аб’ектыўнай рэальнасці. Гіпербала, як правіла, служыць адным ска сродкаў пабудовы градацыйных тэкстаў, у якіх перабольшваюцца якасці і ўласцівасці прыродных з’яў, воднай плыні, фізічныя і духоўныя магчымасці чалавека, глыбіня яго думак і пачуццяў, якія могуць пераносіцца ў незямныя і касмічныя сферы матэрыі. Выкарыстанне гіпербал і градацый у іх розных сэнсава-тэматычных мадыфікацыях пашырае магчымасці актуалізацыі разнастайных аспектаў рэчаіснасці, узмацняе мастацкую выразнасць твора, яго эмацыйна-ацэначны фон, спрыяе больш дакладнаму выяўленню аўтарам сваіх адносін да таго, аб чым гаворыцца ў творы.

### *Літаратура*

1. Мікуліч, М.У. Максім Танк: на скразняках стагоддзя / М.У. Мікуліч. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 254 с.

***Т.Ф. Сухоцкая, г. Мінск***

## Тэма катастрафізму ў эстэтыцы Максіма Танка

Перыяды крызісу з’яўляюцца заканамернай з’явай у развіцці гісторыка-культурных цыклаў, калі спадзяванні на прыход светлай будучыні не спраўджваюцца. Крызісныя сітуацыі, як сведчыць гісторыя, звычайна заканчваюцца сацыяльнымі катастрофамі і нават знікненнем этнасаў. Разбураецца створаная сістэма каштоўнасцей, грамадскія ідэалы і мэты падмяняюцца іх